■ Погляд



# САМІТ У ЭПОХУ ПЕРАМЕН

**Саміт G20, які завяршыўся ў Гамбургу, прадэманстраваў, што такое сустрэча лідараў дваццаці найбуйнейшых эканомік свету ў эпоху перамен. Нават сам яго антураж — маштабныя вулічныя выступленні і сутыкненні з паліцыяй на вуліцах Гамбурга — стаў паказальным фонам для глыбіні праблем, якія на ім спрабавалі вырашыць. Ці атрымалася хоць неяк наблізіцца да гэтага? Паспрабуем прааналізаваць.**

Праблемай нумар адзін для сусветных СМІ сталі адносіны ЗША і Расіі. Першая асабістая сустрэча Трампа і Пуціна абяцала стаць сенсацыяй. І яна не падвяла. Ужо яе рэкордная працяглaсць — дзве з паловай гадзіны — казала сама за сябе. Сустрэча прайшла ў вельмі вузкім складзе, таму пра яе дэталі можна даведацца толькі з адрывістых заяў, зробленых самім Пуціным і Трампам. Заявы абодвух лідараў у цэлым пазітыўныя, хоць Трамп і хваліўся на ўсю моц, як ён агрэсіўна націснуў на Пуціна з нагоды меркаванага ўздзеяння рускіх хакераў на прэзідэнцкія выбары ў ЗША мінулага года.

Ну, а што датычыцца каментарыяў расійскай і амерыканскай прэсы, то яны цалкам прадказальныя. Амерыканская прэса, у большасці рэзка настроеная супраць Трампа, пачала сыпаць звыклымі штампамі пра слабога і недасведчанага прэзідэнта, якога хітры і спрактыкаваны рускі лідар абвёў вакол пальца.

Расійская прэса ўспрыняла сустрэчу пазітыўна, спрабуючы знайсці ў ёй надзею на эфектыўныя дамоўленасці з ЗША, што дазволяць з часам вырашыць украінскую праблему і пазбавіцца ад санкцый. Ці атрымаецца гэта зрабіць? Малаверагодна, пакольkі Трамп з'яўляецца прэзідэнтам ЗША, які мала што можа вырашаць, як паказваюць яго першыя паўгода ва ўладзе. Нават уласная партыя па многіх пытаннях адмаўляецца яго падтрымліваць.

Праблемай нумар два па значнасці стала ўрэгуляванне сірыйскай вайны. Апошнія месяцы па гэтым пытанні пайшоў сур'ёзны зрух. Альянс Расіі, Ірана і Турцыі стаў значнай сілай, якая выказвае зацікаўленасць у варыянце завяршэння вайны па сцэнарыі, у адпаведнасці з якім курды Сірыі стануць часткай адроджанай сірыйскай дзяржавы. Бакі аб'ядналі свае намаганні, пакольkі Расія і Іран проста зацікаўлены ў поўным аднаўленні Сірыі як свайго саюзніка, а для Турцыі важна, каб сірыйскія курды не апынуліся самастойнай сілай на мяжы з Турцыяй і не пачалі смуту сярод турэцкіх курдаў. Між тым для ЗША сірыйскія курды — надзейныя саюзнікі супраць Асада, якога шмат хто ў Вашынгтоне хацеў бы адхіліць ад улады. Пэўным прарывам саміту стала папярэдняя дамоўленасць Пуціна і Трампа па паўднёвай зоне дээскалацыі, дзе Расія і ЗША ўзялі на сябе абавязацельствы забяспечыць спыненне агню.

Значнасць украінскай праблемы для свету знізілася ў сувязі з тым, што ўкраінскі крызіс паволі трансфармуецца ў замарожаны канфлікт. Пра гэта сведчыць правядзенне перамоў па Украіне без удзелу прэзідэнта самой краіны. Украінскі крызіс абмяркоўваўся і на сустрэчы Пуціна з Трампам, і на асобнай сустрэчы Пуціна, Меркель і новага французскага прэзідэнта Макрона, але Парашэнку нікуды не паклікалі. Гэта азначае многае — хоць Украіна і не ўваходзіць у лік дваццаці найбуйнейшых эканомік свету, пры жаданні Меркель магла паклікаць Парашэнку як спецыяльна запрошанага госця.

Праблемай нумар чатыры па інтэнсіўнасці абмеркавання і чакання стала трывожная палітыка з боку КНДР, якая запускае балістычныя ракеты адну за адной і пагражае напасці першай на Паўднёвую Карэю і ЗША пры самым нязначным падазрэнні, што супраць яе задумваюць агрэсію. Ключавую ролю ў спробах вырашэння гэтай далікатнай сітуацыі шмат хто ў свеце адводзіць Кітаю, магутнаму суседу Паўночнай Карэі. Крокаў ад Пекіна ў гэтым кірунку дамагаўся і лідар Японіі ў асабістых перамовах са старшынёй КНР. Але надзеі не апраўдаліся. Кітай сам мае шмат праблем з ЗША і Японіяй, каб аказваць ім садзейнічанне супраць традыцыйнага саюзніка, хоць ён і паводзіць сябе досыць дзіўна.

У пяцёрку праблем увайшла таксама далікатная сітуацыя са свабодным гандлем. Дональд Трамп, яшчэ ідучы на выбары, зрабіў шмат заяў аб неабходнасці заахвочвання амерыканскай эканомікі ўсімі магчымымі метадамі. У гэтай сувязі ён сур'ёзна разглядаецца пратэкцыянізм як адзін з інструментаў. Пераход ЗША ад свабоднага гандлю да пратэкцыянізму выклікаў бы сур'ёзную дэстабілізацыю сусветнага гандлю, таму для лідараў астатніх краін былі важныя запэўніванні ад Трампа, што нічога такога ён усё ж не плануе. І Трамп на гэта пайшоў — у выніковым камюніке саміту зазначаецца прыхільнасць удзельнікаў да свабоднага гандлю.

Некаторыя напярэдадні саміту спадзяваліся, што на ім удзельнікам удасца ўгаварыць Трампа адмовіцца ад рэзкага кроку, які ён зрабіў нядаўна, заявіўшы пра адмову ЗША выконваць Парыжскае пагадненне па клімаце. Гэтыя чаканні не спраўдзіліся. У выніковым камюніке ЗША палічылі за найлепшае ўстрымацца ад згоды ў рэалізацыі гэтай ініцыятывы. А ў выступленні па выніках саміту пра гатоўнасць рушыць услед шляхам ЗША заявіў і прэзідэнт Турцыі.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Блізкая ўлада

# РОСТ ІНВЕСТЫЦЫЙ, ПЛАНЫ «САЦЫЯЛКІ» І ПРАГРАМА ПА ЧЫСТАЙ ВАДЗЕ...

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ адзначыў пазітыўныя моманты і пракаментаваў праблемныя пытанні падчас прэс-канферэнцыі, якая адбылася ў Лідзе.**



Фота БЕЛТА.

Рост эканомікі ў рэгіёне залежыць ад інвестыцыйнай актыўнасці, лічыць Уладзімір Краўцоў. Зараз гэты напрамак развіваецца стабільна, згодна з прагнозам, інвестыцыі ў асноўны капітал за першае паўгоддзе складуць 115%. Усяго заключана дагавораў на рэалізацыю 150 інвестпраектаў. Значнае месца займаюць лагістычныя цэнтры, якія садзейнічаюць транзітнай прывабнасці рэгіёна.

Радуе экспартны патэнцыял, прычым як тавараў, так і паслуг. За першы квартал рост склаў 20%. Яшчэ на 60 млн долараў кантрактаў прывезлі гродзенцы з IV Форуму рэгіёнаў, які нядаўна прайшоў у Маскве. Менавіта з Расійскай Федэрацыяй склаўся самы важкі тавараабарот, прычым экспарт амаль удвая большы, чым імпарт. Гродзенская дэлегацыя запрасіла сваіх партнёраў з рэгіёнаў Расіі прыняць удзел у выстаўцы "Еўрарэгіён «Нёман», якая праходзіць штогод у верасні.

А вось рост заработнай платы пакуль адстае ад запланаванага, зазначыў Уладзімір Краўцоў. Планка пастаўлена высокая — дасягнуць 1000 рублёў. Але гэты рост трэба забяспечыць, а не проста выплаціць грошы. Таму разглядаецца стан кожнай галіны, ідзе адпрацоўка рэзерваў. Пры гэтым улічваецца і сітуацыя на рынку працы. Паступова знімаецца праблема працаўладкавання. У рэгіёне на аднаго беспрацоўнага прыходзіцца амаль дзве вакансіі. Найбольш праблемны раён — Лідскі. Вакансій тут менш, чым беспрацоўных.

Што датычыцца сацыяльнай сферы, акцэнт будзе зроблены на дзіцячых садкі. Сёлета іх узведзена ўжо тры па вобласці, яшчэ тры пачалі будавацца. Асаблівая ўвага надаецца новым мікрараёнам, у прыватнасці Альшанцы, дзе ёсць неабходнасць будаваць яшчэ адну школу. Штогод тут з'яўляецца па 12—15 першых класаў. Таксама да пачатку навучальнага года будзе здадзена прыбудова для малодшых школьнікаў у аграгарадку Больцішкі Воранаўскага раёна. Пры рамонце і рэканструкцыі школ у Гродзенскай вобласці актыўна карыстаюцца пазыкай Сусветнага банка. Што датычыцца медыцыны, сёлета ў Гродне ўводзіцца паліклініка да 650 наведванняў, а таксама хірургічны корпус з новым абсталяваннем у Ваўкавыску.

Не адзін год разглядаецца пытанне будаўніцтва абласнога анкалагічнага цэнтра. Журналісты пацікавіліся, на якой стадыі гэты працэс. Уладзімір Краўцоў паведаміў, што цяпер ідзе распрацоўка дагавора і пошук інвестараў. Праект ажыццяўляецца ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства, і сёлета ёсць магчымасць заключыць дагавор з Міжнароднай фінансавай карпарацыяй Сусветнага банка. Анкалагічных хворых рэгіёна прымае аддзяленне абласной клінічнай бальніцы.

Актуальная для рэгіёна тэма — дарогі. Згодна з даручэннем Прэзідэнта, на Гродзеншчыне за 2—3 гады трэба адрамантаваць каля тысячы кіламетраў мясцовых аўтадарог. Уладзімір Краўцоў паведаміў журналістам, што ў вобласці ўжо прыступілі да гэтай работы. У першую чаргу пройдзе рамонт дарог ад райцэнтраў да аграгарадкоў, затым паміж іншымі населенымі пунктамі. Таксама значная работа вядзецца па рэканструкцыі найважнейшага транспартнага калідора — аўтадарога М6 Мінск — Гродна — граніца з Рэспублікай Польшча. Што датычыцца паскарэння руху на чыгунцы, аб чым запыталі прадстаўнікі СМІ, пакуль гэта пытанне будучага, бо электрыфікацыя магістралі патрабуе значных сродкаў. Больш запатрабаваным у гродзенцаў стаў чыгуначны турыстычны маршрут Гродна — Варшава — Кракаў, які курсіруе штодня. Ёсць неабходнасць павялічыць рухомы састаў.

Падчас прэс-канферэнцыі было ўзнята пытанне аб якасці пітной вады. Гэта праблема актуальная, падкрэсліў Уладзімір Краўцоў. Калі ў гарадах якасць вады ў норме, то ў сельскай мясцовасці маецца патрэбна яе абезжалезіць. Такіх населеных пунктаў каля 100. Цяпер ідзе распрацоўка праекта на будаўніцтва ў аграгарадках 20 станцый з выкарыстаннем пазыкі Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Таксама на гэтыя мэты ў наступныя два гады будзе выдзелена два мільёны рублёў мясцовага бюджэта.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
*margo@zviazda.by*
*г. Ліда*

Славянскі базар у Віцебску

# Дзесяць дзён, якія ўразяць культурны свет

**Учора распачаўся XXVI «Славянскі базар у Віцебску». Афіцыйна ён адкрыецца толькі 13-га, закрыецца — 17 ліпеня. Аднак па добрай традыцыі на міжнародным фестывалі мастацтваў ёсць так званыя неафіцыйныя дні. Тры з іх праходзяць зараз, а два будуць пасля закрыцця фэсту. У выніку ўвесь «базар» расцягнецца на 10 дзён.**




Фота БЕЛТА.

## НА НОВАЙ ПЛОШЧЫ...

Спачатку пра новыя аб'екты ў горадзе. Гэта таксама штагадовая «звычка» на «базары».

Каля «чашы» амфітэатра зрабілі фактычна новую плошчу. Старажылы памятаюць, што калісьці там знаходзіліся тэнісныя корты. Але потым вялікі вулічны прамавугольнік доўгі час ніяк не выкарыстоўваўся.

Апошнія некалькі гадоў на ім заліваюць каток. Летась на «базары» там правялі цырымонію ўзнясця сцяга фестывалю. І сёлета так будзе. А ў далейшым плануецца на гэтым месцы праводзіць мерапрыемствы на свежым паветры: ад дыскатэк да канцэртаў і міні-фестываляў. Таксама задумана, што тут створаць «гарадок» для аматараў катацца на ролікавых дошках, ролікавых каньках, веласіпедах ВМХ, на якіх можна паказваць «трукі».

Яшчэ рэканструявалі крытыя збудаванні комплексу амфітэатра (каля падземнага перахода). І там будзе кіпець культурнае жыццё.

А ў парку Фрунзэ — насупраць галоўнай сцэнічнай пляцоўкі «базару» — усталявалі новы фантан.

У раёне дырэкцыі адкрылі кафэ, у тым ліку і ўзбекскай кухні. У апошнім манты каштуюць усяго рубель за порцыю. Дарэчы, сёлета на фэсце яшчэ больш стане вулічных кавярняў. І ўпершыню пройдзе акцыя «Вулічны пікнік». У дырэкцыі фестывалю ўдакладнілі, што шмат смачнай ежы на пікніку — у раёне канцэртнай залы «Віцебск». На шляху да месца будучай трапезы ўсталявалі гіганцкае зялёнае крэсла.

## «ЗОРАЧКІ» І «ЗОРКІ»

Сёлета вага абсталявання, якое прывезлі з Масквы для Летняга амфітэатра, каля 85 тон. Як заўсёды, пры сцэнаграфічным і светлавым афармленні не будзе паўтораў мінулых гадоў. «Аксесуары» зайграюць мноствам фарбаў, будуць падымацца і апускацца, нават лятаць!

Самай яскравай падзеяй стане цырымонія адкрыцця фэсту. Сярод заяўленых іншаземных «зорак» Крыс дэ Бург, Хуліа Іглесіяс-малодшы, брытанская група Londonbeat і іншыя. Спяе і іераманах Фоцій, пераможца тэлевізійнага шоу «Голас».

Выступіць таксама і ўладальнік Гран-пры XV дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск», які праходзіць з 10 па 13 ліпеня. Міжнароднае журы ўзначальвае заслужаная артыстка Расіі Варвара. Беларусь прадстаўляе 12-гадовая Маша Магільная. Яна вучыцца ў Магілёўскай гарадской гімназіі №1, у музычнай школе пры гімназіі (па класе фартэпіяна). Займаецца вакалам у арт-студыі «Анёлы дабра». Дзяўчынка летась стала лаўрэатам І Прэміі міжнародных вакальных конкурсаў «Зорныя кветкі» (Мінск), «Зорны дождж у Празе» (Чэхія), «Riga Symphony» (Латвія). У яе скарбонцы творчых дасягненняў — Гран-пры Міжнароднага музычнага сербскага фестывалю «Little Shells».

Спяюць і ўдзельнікі сёлетняга — XXVI Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні. Гонар нашай краіны на ім адстойвае 19-гадовы Ягор Шаранкоў, саліст Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам М. Я. Фінберга. Ён двойчы быў фіналістам дзіцячага адборачнага тура "Песня для "Еўрабачання". Атрымаў Гран-пры беларускіх міжнародных конкурсаў «Зямля пад белымі крыламі», «Залатая пчолка». Удастоены прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Летась быў у ліку прэтэндэнтаў на ўдзел у «Еўрабачанні». Кіраўнік журы конкурсу маладых спевакоў — вядомая балгарская спявачка і прадзюсар Ярданка Хрыстава.

Учора ўпершыню ў Віцебску прэзентавалі выставу графікі Рэмбранта. Каля 70 гравюр вялікага галандскага мастака можна ўбачыць у Мастацкім музеі.

Сёння ноччу ў Летнім амфітэатры скончыўся першы сольны канцэрт — Зары. А вечарам тут выступіць Рыгор Лепс.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**
*pukshanski@zviazda.by*